ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1981
21
МАЯ
ЧАЦВЕР
№ 20 (1320)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

● АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

## ЧАКАЕМ АБІТУРЫЕНТА-81

Яшчэ не развіталіся з вучнёўскай партай будучыя абітурыенты-школьнікі, яшчэ да ўступных экзаменаў у ВНУ некалькі месяцаў, але прыйшла пара падвесці першыя вынікі прафарыентацыйнай работы, праведзенай ва універсітэце. Слова адказнаму сакратару прыёмнай камісіі БДУ імя У. І. Леніна Р. А. ЖМОЙДЗЯКУ:

— Значны вопыт прафесійнай арыентацыі сярод працоўнай і вучнёўскай моладзі назапашаны за прайшоўшы час. У сваёй рабоце мы, на мой погляд, удала спалучаем «стацыянарныя» і «выязныя» формы масавай агітацыі.

**— ДА ПЕРШАЙ АДНОСЯЦЦА ФАКУЛЬТЭЦКІЯ ШКОЛЫ ЮНЫХ?**

— Так. Школы юнага фізіка, матэматыка, географа, праграміста і г. д. працуюць на 10 факультэтах універсітэта і даюць нам найбольш падрыхтаваную і зацікаўленую частку абітурыентаў. Амаль 1400 чалавек займаюцца ў іх у гэтым годзе. Найбольш актыўна працуюць школы на хімфаку (кіраўнік дацэнт С. А. Мячкоўскі) і гістфаку (дацэнт Э. М. Загарульскі).

**— РАСКАЖЫЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АБ УНІВЕРСІТЭЦКІХ ПАДРЫХТОЎЧЫХ КУРСАХ.**

— Самае каштоўнае ў іх рабоце — фарміраванне ў навучэнцаў устойлівай прафесійнай накіраванасці разам з магчымасцю для кожнага паўтарыць і ўдакладніць веданне школьнай праграмы. На вочных, вячэрніх і завочных курсах рыхтуюцца да прыёмных экзаменаў больш за 4900 чалавек, 66 працэнтаў з якіх маюць стаж практычнай работы. Рэгулярна арганізуюцца сустрэчы слухачоў курсаў з вядучымі вучонымі і кіраўнікамі факультэтаў.

**— ТАКІЯ СУСТРЭЧЫ ПРАВОДЗЯЦЦА, ЯК ПРАВІЛА, І Ў РАМКАХ «ДЗЁН АДКРЫТЫХ ДЗВЯРЭЙ»?**

— На сустрэчах з выпускнікамі школ дзевяці раёнаў горада Мінска выступілі рэктар БДУ акадэмік АН БССР У. А. Белы, прарэктары, дэканы, члены прыёмнай камісіі. Да таго ж, супрацоўнікі і студэнты кожнага факультэта больш падрабязна азнаёмілі будучых абітурыентаў з асаблівасцямі сваёй спецыяльнасці ў час правядзення традыцыйных «Дзён адкрытых дзвярэй», арганізавалі экскурсіі па вучэбных кабінетах, музеях, лабараторыях.

**— ЯКІЯ ЯШЧЭ ФОРМЫ ПРАФАРЫЕНТАЦЫІ ВЫКАРЫСТОЎВАЛІ У ПЕРЫЯД ПАДРЫХТОЎКІ ДА ПРЫНЯЦЦЯ НОВАГА ПАПАЎНЕННЯ?**

— Традыцыяй сталі выступленні студэнтаў у школах па месцу жыхарства ў час зімовых канікулаў, выезды студэнцкіх агітбрыгад па заданню прыёмнай камісіі. Наш сакратарыят, дэканаты, куратары акадэмічных груп падрабязна інструктуюць выязджаючых, забяспечваюць іх літаратурай аб універсітэце, факультэтах.

Аб адным карысным пачынанні нельга не сказаць: 4 агітбрыгады выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта выязджалі ў гарады і вёскі Беларусі па распрацаваных прыёмнай камісіяй маршрутах. У час гэтых паездак было праведзена больш 1000 выступленняў перад школьнікамі, маладымі рабочымі, калгаснікамі і ваеннаслужачымі. Распаўсюджана значная колькасць буклетаў, брашур, плакатаў, газет і кароткіх даведак аб універсітэце, дэманстраваўся дакументальны фільм «Запрашае універсітэт». Думаю, такія выезды таксама стануць традыцыйнымі.

**— ЯКІЯ ВЫВАДЫ ЗРАБІЛА ПРЫЁМНАЯ КАМІСІЯ, АНАЛІЗУЮЧЫ СВАЮ РАБОТУ?**

— Нашы дасягненні і пралікі, безумоўна, выкрышталізуюцца ў час падвядзення вынікаў чарговага набору. Зараз аб гэтым гаварыць яшчэ рана. Хацелася б адзначыць наступнае: усе мерапрыемствы па прафесійнай арыентацыі ва універсітэце загадзя дакладна распрацоўваліся, разглядаліся і зацвярджаліся саветам універсітэта. Канцэнтрацыя інфармацыі ў прыёмнай камісіі і рэктарацe дазваляла ўводзіць у практыку вопыт работы лепшых падраздзяленняў, назапашваць матэрыял аб эфектыўнасці таго, што зроблена. Таму мы і падышлі да непасрэднай сустрэчы з абітурыентам-81, як кажуць, у поўнай баявой гатоўнасці.

Запісала
Т. САХАШЧЫК.

"Беларускі універсітэт"

## ТЭЛЕТАЙП

• Учора • Сёння • Заўтра •

### У ТУРЫСТЫЧНЫМ ПАХОДЗЕ

па месцах баявой славы савецкага народа, які арганізавалі партбюро і камітэт камсамола хімічнага факультэта сумесна з кафедрай фізічнага выхавання і спорту, прынялі ўдзел студэнты мехмата і геафака. Перад пачаткам паходу на мітынгу каля помніка ахвярам лагера смерці ў Масюкоўшчыне выступілі сакратар партыйнага бюро хімфака Л. М. Аўсянка і ўдзельнік баёў за вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Б. А. Сяргунін.

Д. МЫЧКО,
намеснік сакратара камітэта камсамола хімфака.

### АГЛЯД-КОНКУРС

насценнага друку ўсіх факультэцкіх кафедр правялі прафбюро фізфака і рэдакцыя насценнай газеты «За навуку». Ідэйная накіраванасць, высокі ўзровень мастацкага афармлення, перыядычнасць выпуску больш за ўсё ўласцівы газетам «Фокус» — кафедра агульнай фізікі, «Імпульс» — кафедра ядзернай фізікі, «Двайная спіраль» — кафедра біяфізікі. Па колькасці балаў блізкія да лідэраў «насценкі» кафедр тэарэтычнай фізікі і фізікі паўправаднікоў.

В. ДРАКО,
старшы выкладчык кафедры фізікі цвёрдага цела.

### НА ЧАРГОВЫХ

занятках семінара «Некаторыя пытанні методыкі правядзення навуковых даследаванняў» перад супрацоўнікамі навукова-даследчага інстытута фізіка-хімічных праблем з лекцыяй «Метадычныя ўказанні да складання заяў на вынаходніцтвы» выступілі Л. Г. Кот і Л. П. Рогач.

А. ЦВЯХ.

### ДЭЛЕГАЦЫЯ ПРАДСТАЎНІКОЎ

Белдзяржуніверсітэта ўдзельнічала ў правядзенні Тыдня дружбы ў Самаркандзе, які быў арганізаваны універсітэтам імя Алішэра Наваі. На фестывалі палітычнай песні (у праграме тыдня) выступілі лаўрэаты рэспубліканскага і ўсесаюзнага фестываляў палітычнай песні, студэнты-філолагі Алег Ацьман і Алена Булыга. Яны ўдзельнічалі ў шэфскіх канцэртах у калгасе імя Ф. Энгельса і на прадпрыемствах горада.

У. МАКАРЭВІЧ,
дырэктар студэнцкага клуба.

● ПАЗЫЎНЫЯ СЕСІІ

## ІДУЦЬ ЗАЛІКІ...

МАЙ для студэнта — не толькі прыгожыя кветкі над Свіслаччу і цёплае сонейка. Май — набліжэнне сесіі. І першыя ластаўкі яе — залікі.

Каля 23-й аўдыторыі геафака цішыня. Другая група чацвёртага курса здае залік па эканамічнай геаграфіі БССР. Пачаргова заходзяць і выходзяць студэнты. Сумны выйшаў Андрэй Мартынаў. Незалік. Значыць, дрэнныя веды. Але такіх нямнога. Да карты падыходзіць Святлана Разумова. Бачна адразу — студэнтка падрыхтавалася дасканала.

Сяргей Іванавіч Сідар выкладаў прадмет два семестры, і ён добра ведае магчымасці кожнага студэнта. Адпаведна і пытанні па тэме. Дакладна адказвае Святлана, выкарыстоўваючы галоўны наглядны дапаможнік — карту эканамічнага развіцця БССР у апошняй пяцігодцы. Пытанняў больш няма. Сяргей Іванавіч распісваецца ў залікоўцы і падае яе Святлане:

— Выдатна. Я задаволены. Усяго вам добрага і ў далейшым. Наступны!..

Ціха адчыняюцца і зачыняюцца дзверы. Усмешка на твары, радасць сяброўак... Гэта добры пачатак.

**НА ЗДЫМКАХ:**

**1. Вось ён, момант! Кандыдат геаграфічных навук дацэнт кафедры эканамічнай геаграфіі СССР С. І. Сідар мае права ацаніць адказ двума словамі — «залік» — «незалік»...**

**2. Каля геаграфічнай карты — Святлана Разумова.**

**В. ШАЧАК.**
Фота аўтара.





*На рэдакцыйным сталe нумар рэспубліканскай газеты «Звязда» ад 9 мая гэтага года. На першай паласе, разам з віншаваннямі з Днём Перамогі, змешчаны Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР аб узнагароджанні дырэктара навукова-даследчага інстытута фізіка-хімічных праблем Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна Свірыдава Вадзіма Васільевіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.*

*Месяцам раней, 9 красавіка, В. В. Свірыдаў адзначыў свой пяцідзесяцігадовы юбілей. Амаль усё свядомае жыццё — 34 гады — прысвяціў ён універсітэту, усе гэтыя гады ім валодала нязтольнае імкненне руху наперад, неабходнасць дзеяння.*

# ПРАВА БЫЦЬ НАПЕРАДЗЕ

**БЯРЫ ПРЫКЛАД, СУЧАСНІК!**

НАРЭШЦЕ мне пашанцавала. Вадзім Васільевіч увайшоў у прыёмны пакой з прыгожым букетам веснавых кветак. Прывітаўся і працягнуў сакратаршы букет:

— Вазьміце, калі ласка. Набярыце ў вазу вады і пастаўце на сваім стале. Маладосць і кветкі вельмі добра ўжываюцца... А вы да мяне?

І, пачуўшы маё сцвярджальнае «так», шырока расчыніў дзверы:

— Заходзьце.

Яшчэ да сустрэчы з В. В. Свірыдавым я ўяўляў абрысы яго твару, фігуру, стараўся нават вызначыць характар і, няхай даруе мне маю смеласць Вадзім Васільевіч, яго паводзіны з незнаёмымі людзьмі. Магчымасць для гэтага была. Яго імя неаднойчы паяўлялася на старонках «Беларускага універсітэта; шмат добрых слоў чуў у адрас інстытута, які ўзначальвае В. В. Свірыдаў.

— Дык вы з газеты? Тут учора ваш калега з фотаапаратам прыходзіў. Столькі розных лямпаў прыцягнуў, што мне яго нават шкада стала: з-за мяне, бедны, мучыцца...

І раптам ціха спытаў:

— А можа не варта пісаць? У нас шмат добрых вучоных ёсць. Хімікаў таксама.

У яго голасе гучала натуральная, непрыкрытая разгубленасць.

Але ўбачыўшы, што пераконваць мяне няма сэнсу, ветліва запрасіў сесці.

І тады я для сябе адзначыў, што не памыліўся. Перада мной быў самы звычайны чалавек. Сціплы, з добрымі, разумнымі вачыма, з густымі, пабеленымі сівізной валасамі. Нават голас у яго быў зусім не «начальніцкі»: ціхі, спакойны. Калі б не строгі рабочы стол са шматлікімі папкамі, кнігамі, часопісамі, тэлефонамі, калі б не стук пішучай машынкі ў прыёмным пакоі, нельга было б падумаць, што гэта вядомы вучоны-хімік, член-карэспандэнт АН БССР, дырэктар навукова-даследчага інстытута фізіка-хімічных праблем БДУ імя У. І. Леніна, загадчык кафедры неарганічнай хіміі, заслужаны дзеяч навукі БССР, член шматлікіх навуковых камісій і секцый, старшыня савета па абароне дысертацый... Вось далёка не поўны пералік яго пасад і званняў, грамадскіх даручэнняў.

— Толькі што адбылася абарона кандыдацкай дысертацыі. Супрацоўніца нашага інстытута, вельмі здольны малады вучоны, прапанавала цікавую работу. Сэнс яе — у новай тэхналогіі атрымання гідратцэлюлозных валокнаў, а таксама валокнаў, што ўтрымліваюць сінтэтычныя палімеры. Ужо атрымана значная колькасць новых валокнаў у заводскіх умовах у горадзе Калініне. У хуткім часе наша тэкстыльная прамысловасць асвоіць новую тэхналогію атрымання гідрацэлюлозных валокнаў.

І нечакана ўзрушана дадаў:

— Гэта вельмі цудоўна, што на змену прыходзіць дапытлівая, дасціпная моладзь.

Шлях Вадзіма Васільевіча ў хімію, у вялікую навуку незвычайным не назавеш, хоць тут і ёсць свае адметныя бакі. Дзяцінства прайшло ў вёсцы Вязынь, што на Міншчыне. Хлопчыку было 10 гадоў, калі пажар вайны апаліў краіну. Вораг адабраў усё: свабоду, дзяцінства, магчымасць вучыцца. Адзіным падручнікам, які Вадзім за гады вайны перачытаў безліч разоў, была «Хімія» Някрасава для студэнтаў ВНУ. Напэўна, іменна яна з'явілася тым штуршком, той пуцяводнай зоркай, калі можна так сказаць, што вызначыла затым увесь далейшы лёс Вадзіма Свірыдава. У 16 гадоў ён паспяхова закончыў сярэднюю школу і ў 1947 годзе паступіў на хімічны факультэт універсітэта, які



стаў для яго яшчэ адной сур'ёзнай жыццёвай школай. Адразу ж пасля заканчэння БДУ Свірыдаў паступае ў аспірантуру і ўжо ў 24 гады абараняе кандыдацкую дысертацыю, пачынае працаваць на кафедры неарганічнай хіміі.

Успамінаючы тыя часы, ён гаворыць:

— Дваццаць пяць гадоў назад я, малады вучоны, разумеў, што працую ў перыферыйным універсітэце: ні добрай базы, ні магчымасці весці фундаментальныя даследаванні БДУ не меў. Параўноўваючы той час з днём сённяшнім, пачынаеш разумець, які значны крок наперад мы зрабілі, адчуваеш, як Камуністычная партыя клапоціцца аб развіцці вышэйшай школы, навукі. Цяпер універсітэт стаў адной з вядучых навучальных і даследчых устаноў краіны. Многія работы нашых вучоных і студэнтаў адзначаны самымі ганаровымі ўзнагародамі і высока ацэнены не толькі ў краіне, але і за мяжой.

Мне, у сваю чаргу, хочацца дадаць наступнае. Ні адна з 29 дысертацый, што абаранілі пад яго кіраўніцтвам былыя выпускнікі хімічнага факультэта, не была вернута вышэйшай атэстацыйнай камісіяй на дапрацоўку. І гэта ў той час, калі патрабаванні да іх якаснага боку значна павысіліся.

Вадзім Васільевіч больш за ўсё гаварыў пра універсітэт, пра змены, што адбыліся ў жыцці буйнейшай навучальнай установы і сведкай якіх быў ён сам. Але нават і словам не ўпамянуў пра сябе. Ды толькі я здагадваўся, адчуваў, што гэта — ад сціпласці, што іменна такія людзі, як В. В. Свірыдаў, выконваюць большасць службовых і грамадскіх спраў.

В. В. Свірыдаў не хоча жыць толькі днём сённяшнім. І як чалавек, і як кіраўнік, і як вучоны. Ён разумее, што калі прытрымлівацца толькі цесных рамак «зручна-нязручна», калі быць блізарукім і нерашучым у пошуках новага, можна страціць перспектыву, толькі не тую перспектыву, якая характарызуе ўласны рост па службе, а перспектыву заўтрашняга развіцця навукі.

— Нельга не думаць пра будучае. Можа гэта крыху банальна, але ў мяне ёсць сшытак, у які я занатоўваю свае планы, задумы, мары, калі хочаце. Тое, што хвалюе мяне як вучонага-хіміка, як дырэктара інстытута — у гэтым сшытку. Кіравацца ўсім вядомымі ісцінамі дзеля спакойнага жыцця — хіба ж гэта можа стаць правілам для вучонага? Не, не і яшчэ раз не!

І працягвае:

— Многім калектывам не ўдаецца пазбегнуць так званага «крызісу жанру». Думаю, што нашаму калектыву гэта хвароба не пагражае. На многа гадоў наперад хопіць нам цікавай, карыснай работы.

Актыўная жыццёвая пазіцыя, гарэнне, нястомны пошук вызначаюць В. В. Свірыдава. Гэтыя рысы праяўляюцца і на пасяджэннях камісіі па хіміі фатаграфічных працэсаў пры прэзідыуме АН СССР, і ў рабоце хімічнай секцыі Навукова-метадычнага савета Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, членам якіх ён з'яўляецца, і ў навукова-даследчай рабоце на кафедры. Гэта вельмі адказная і пачэсная справа — быць вучоным і педагогам, спалучаць якасці даследчыка і арганізатара. Ім падрыхтавана больш 300 навуковых артыкулаў, зроблена 50 вынаходніцтваў, ён сааўтар двух вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў хімічных факультэтаў. Нядаўна на пытанне насценнай газеты «Што вы лічыце галоўным са зробленага вамі?» В. В. Свірыдаў адказаў: «Галоўнае ў тым, што сярод тых, хто высока нясе сцяг савецкай навукі, ёсць і мае вучні».

У сапраўднага вучонага, як і ў камандзіра, ёсць толькі адно права — права быць наперадзе. Гэта права дае яму аўтарытэт, уменне весці за сабой іншых. Вадзім Васільевіч Свірыдаў з ліку такіх. Нездарма яго правілам сталі словы:

— Кожны, хто займаецца навукай, павінен рабіць сваю справу так, як гэтага патрабуе абавязак. Як мёртвая тэорыя без практыкі, так чалавечыя здольнасці, нават самыя фантастычныя, — нішто без пастаяннай, мэтанакіраванай працы.

**А. ЛАЗОЎСКІ.**
Фота **В. Шачака.**

# СУСТРЭЧА




ВАЙНА... Чым далей у мінулае адыходзіць гэта страшнае слова, тым мацней павінна быць памяць пра тых, хто да самага фашысцкага логава данёс чырвоны сцяг вялікай народнай Перамогі, хто загінуў, не пачуўшы яе мірнага салюта.

Гэта сустрэча была арганізавана камітэтам камсамола універсітэта сумесна з Уздзенскім раённым камітэтам партыі. Шмат давялося папрацаваць членам універсітэцкай групы «Доўг», каб адшукаць былых партызан брыгады імя К. Я. Варашылава, якая ў гады Вялікай Айчыннай вайны дзейнічала на тэрыторыі Уздзенскага раёна. Спакваля, па крупіцах збіралі яны адрасы, пісалі пісьмы ў розныя канцы нашай неабсяжнай краіны, перш чым стала магчымай сустрэча з тымі, хто набліжаў Дзень Перамогі, хто нават праз 36 гадоў памятае, якімі намаганнямі, якой цаной яна здабыта...

Сонцам, кветкамі, першым веснавым дажджом сустрэла іх беларуская сталіца. З розных куткоў рэспублікі, з Масквы і Ленінграда, з Украіны і Башкірыі прыехалі яны ў Мінск. Прыехалі, каб зноў сустрэцца са сваімі баявымі таварышамі, прайсціся знаёмымі партызанскімі сцежкамі, ускласці вянкі да брацкіх магіл, каб «успомніць былыя гады». А ім ёсць аб чым успомніць. Калі б хто-небудзь паспрабаваў запісаць скупыя хвалюючыя ўспаміны былых разведчыкаў і сувязных, падпольшчыкаў і падрыўнікоў, камандзіраў і радавых партызан, то іх хапіла б не на адну кнігу, дзе кожная старонка — прыклад мужнасці, гераізму і стойкасці, сведчанне непарушнай вернасці савецкай Радзіме. І вось гэта памяць, святло шчаслівай вясны, адказнасць за лёс будучых пакаленняў прывялі іх да Вечнага агню на плошчы Перамогі...

Раніца 8-га мая. У галоўным корпусе універсітэта, на факультэтах і на кафедрах у гэты дзень было па-святочнаму ажыўлена: у госці да юнакоў і дзяўчат, студэнтаў БДУ, да сва-



# ПРАЗ 36 ГАДОЎ

іх сыноў і ўнукаў прыйшлі ветэраны вайны. У кожнага з іх на грудзях узнагароды за баявыя і працоўныя подзвігі, на целе — балючыя раны вайны, а ў вачах — вера і надзея ў тое, што яна ніколі не павінна паўтарыцца. Мо таму нельга было без хвалявання слухаць іх расказы пра тыя векапомныя дні.

Мірна жылі людзі. Кожны з іх быў заняты сваёй справай. Адны вырошчвалі хлеб і гадавалі дзяцей, другія лячылі хворых і будавалі гарады, іншыя вучылі ці самі вучыліся на будаўнікоў і інжынераў, урачоў і настаўнікаў. І было гэта самай звычайнай, будзённай справай. Ды толькі вораг парушыў мірнае жыццё, перашкодзіў стваральнай працы. І калі чорны цень фашысцкай навалы навіс над нашай краінай, кожны з іх — рабочы ад станка, муляр ад кельмы, калгаснік ад плуга, — як адзін, узняўся на абарону сваёй Радзімы, сваёй свабоды і незалежнасці. Іх розум стаў халодны, воля — жалезнай, іх уласнае жыццё стала жыццём агульным, а цывільная вопратка ўступіла месца салдацкім гімнасцёркам і шынялям, папахам з чырвонай стужкай. Нямногія з іх былі кадравымі ваеннымі, не ўсе да гэтага часу зброю трымалі ў руках. Але яны твар ў твар сустрэлі тых, хто паставіў на калені амаль усю Еўропу, хто рваўся да сусветнага панавання. Узняліся і выстаялі, выстаялі і перамаглі. У адным страі былі рускія і беларусы, украінцы і татары, башкіры і ўзбекі, казахі і грузіны — сыны і дочкі розных народаў, грамадзяне новага сацыялістычнага грамадства.

Назаўтра народных мсціўцаў віталі жыхары гарадскога пасёлка Узда і навакольных вёсак. Калоны дэманстрантаў сцякаліся да цэнтральнай плошчы гарадскога пасёлка, дзе павінен быў адбыцца святочны мітынг. Разам з бацькамі ішлі дзеці, з дзядулямі — унукі, з ветэранамі — будучае нашай краіны. У кожнага ў руках былі жывыя кветкі, рознакаляровыя паветраныя шары, а над імі, нібы пафарбаваныя крывёю загінуўшых, чырвоныя сцягі.

Мітынг адкрыў першы сакратар РК КПБ А. І. Мяцельскі. Адзін за адным паднімаюцца на трыбуну былыя партызаны, і здаецца, што ажываюць старонкі мінулага. Шмат пакут і гора зведала гэта зямля. У кожнай вёсцы брацкія магілы савецкіх воінаў і партызан, помнікі мужнасці і славе савецкага чалавека. Слухаюць людзі, хвалююцца ўспамінамі ветэранаў, герояў-землякоў, і вераць, што такое ніколі не паўторыцца.

Вянкі і букеты жывых кветак да помніка У. І. Леніну, да брацкай магілы партызанам брыгады імя К. Я. Варашылава, што загінулі на ўздзенскай зямлі, ускладаюць кіраўнікі партыйных, савецкіх, камсамольскіх арганізацый, ветэраны і школьнікі. Ва ўрачыстым караўле застылі піянеры.

Затым аўтобусы з былымі партызанамі накіроўваюцца ў вёску Віркава, дзе ў гады вайны размяшчаўся штаб брыгады, у Лоўскі лес.

Хто з нас не ведае пра бой у Лоўскім лесе! 13 снежня 1943 года семнаццаць партызан на чале з камандзірам узвода В. І. Драздовічам амаль чатыры гадзіны адбівалі атакі рэгулярных фашысцкіх часцей, знішчылі 85 карнікаў. Пеклам стала для ворагаў гэта зямля, а для нас—прыкладам мужнасці і гераізму. Перад смерцю партызаны напісалі на шматку паперы: «Паміраем за Радзіму... Просім лічыць камсамольцамі». Гэта запіска дайшла да нашчадкаў. Радзіма не забыла сваіх сыноў. Пасмяротна яны былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, а камандзіру ўзвода В. І. Драздовічу было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Яны загінулі, цаной уласнага жыцця затрымалі ворага, дазволілі эвакуіраваць шпіталь, зберагчы асноўныя сілы брыгады.

Тут, на месцы былога бою, я пазнаёміўся з дзвюма жанчынамі, партызанкамі брыгады. Гэта Валянціна Ўладзіміраўна Чмірова і яе малодшая сястра Рэгіна Уладзіміраўна Ражкова. Маладымі дзяўчатамі пайшлі яны ў партызанскі атрад. Валянціне тады было 23 гады, а Рэгіне і таго менш — дваццаць. Разам з імі сталі партызанамі бацькі і малодшыя сёстры. Восем чалавек налічвала партызанская сям'я. Сёстры былі разведчыцамі, выконвалі важныя даручэнні партызанскага камандавання. Колькі разоў небяспека пагражала ім, не аднойчы прыходзілася ратавацца ад варожых аблаў. Дапамагалі савецкія людзі. І нянавісць да фашысцкіх катаў. Нельга без хвалявання слухаць, як фашысты і іх паслугачы на парозе бацькоўскай хаты закалолі штыкамі двухмесячнага сына Валянціны Уладзіміраўны. Гэта было на другі дзень пасля таго, як яна пайшла ў лес. Партызанская сям'я змагалася з ворагам да таго дня, пакуль Перамога не прыйшла на родную зямлю.

А ты, хлапчук, што нарадзіўся праз многа год пасля пераможнай вясны сорак пятага, ты, што ведаеш вайну толькі па кніжках і фільмах, ганарыся тым, што трапіў на адзін здымак з партызанам. Магчыма, іменна яму ты абавязаны сваім сённяшнім жыццём, іменна яго цела засланіла цябе ад кулі! Помні пра гэта!

Шмат помнікаў на беларускай зямлі. Але самы дарагі і вечны — памяць чалавечая і павага. Пакланіся, чытач, В. У. Чміровай і Р. У. Ражковай, іх бацькам і сёстрам, В. Д. Петухову — партызану-кулямётчыку, які быў удзельнікам лоўскага бою, Р. Д. Пясоцкай, **былой на**стаўніцы Марата Казея, а затым — падпольшчыцы і партызанцы, камандзіру роты атрада імя Б. Хмяльніцкага І. К. Цыпкіну і многім-многім вядомым і невядомым героям за тое, што яны адстаялі мір, даравалі жыццё і радасць стваральнай працы не толькі табе і мне, але і будучым пакаленням. Яны і сёння ў страі, гатовы ісці ў атаку. Пакланіся мужнасці В. І. Драздовіча і байцоў яго ўзвода. У мінуту маўчання схілі сваю галаву перад памяццю тых, хто не дажыў да светлага Дня Перамогі, хто загінуў, каб шумелі зялёным убраннем партызанскія бярозы і звінелі недзе там, ля самага сонца, жаўрукі. Ах, як хораша яны спяваюць! Слухайце, людзі!

**А. ФАМІЧОЎ,**
**наш спец. кар.**

Фота **аўтара і В. Шачака.**

**ВЕКАПОМНАЕ**







# ЛЕТАПІС БДУ

**(Пачатак у №№ 4, 6, 7, 8, 10—19).**

**1968 год**

**30 студзеня**

Рэспубліканская нарада ва універсітэце па пытаннях выкладання грамадскіх навук.

**Люты**

Урачысты сход, прысвечаны 50-годдзю Савецкай Арміі. 83 супрацоўнікі універсітэта ўзнагароджаны медалямі «50 год Узброеных Сіл СССР».

Пачаў работу факультэт павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

**Кастрычнік**

Здадзены ў эксплуатацыю студэнцкі інтэрнат на вуліцы Кастрычніцкай.

**Лістапад**

Арганізацыя ва універсітэце навукова - метадычнага савета як дапаможнага органа пры вучоным савеце.

**10 снежня**

Адкрыццё юбілейнай навуковай сесіі універсітэта, прысвечанай 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі.

**16 снежня**

У азнаменаванне поспехаў у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, у навуковых даследаваннях, улічваючы вялікі ўклад у камуністычнае будаўніцтва і выкананне сацыялістычных абавязацельстваў у гонар 50-годдзя БССР і КПБ, ЦК КПБ, Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР, Савет Міністраў БССР і Белсаўпроф узнагародзілі універсітэт памятным Чырвоным сцягам.

**Снежань**

За апошняе пяцігоддзе ва універсітэце абаронена 52 доктарскія і 299 кандыдацкіх дысертацый, у тым ліку супрацоўнікамі БДУ — 25 доктарскіх і 140 кандыдацкіх.

На чэмпіянаце краіны па міжнародных шашках студэнт А. Гантварг разам з чэмпіёнам свету А. Андрэйкам (Рыга) падзяліў першае і другое месцы і атрымаў права на прысваенне звання «Гросмайстар СССР».

**27 снежня**

Прэмія Ленінскага камсамола прысуджана прафесару В. П. Платонаву.

Ва універсітэце падрыхтавана 7 майстроў спорту СССР, з іх адзін міжнароднага класа, 50 кандыдатаў у майстры спорту СССР і першаразраднікаў, 1618 спартсменаў другога і трэцяга разрадаў.

**Лета**

У спаборніцтве спартсменаў ВНУ Беларусі, прысвечаным 50-годдзю БССР і КПБ, валейбалісты універсітэта заваявалі тытул чэмпіёнаў рэспублікі.

У працоўным семестры ўдзельнічала 1850 чалавек. Студэнты працавалі на будоўлях Беларусі, Казахстана, Эстоніі, Цюмені, Нарыльска, у ГДР і іншых месцах.

**(Працяг будзе).**

*«...клопат аб патрэбах працуючай студэнцкай моладзі — не самамэта. Ён садзейнічае павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, дазваляе прыцягнуць да стваральнай працы дзесяткі тысяч маладых, энергічных працоўных рук».*

*(«Праўда», 25 красавіка 1981 года).*

● ДАВАЙЦЕ АБМЯРКУЕМ

# РЭБУС

НІ ДЛЯ КАГО НЕ САКРЭТ, што на адну стыпендыю студэнту пражыць цяжкавата, таму таты і мамы забяспечваюць сваіх адзіных даволі шчодра. Ну, а калі стыпендыі няма і не прадбачыцца? Калі бацькі не маюць магчымасці песціць «дзіця» частымі грашовымі пераводамі? Куды дзецца «дзіцяці»? Звычайна ідуць працаваць начным вартавым у пазаведамасную ахову, дворнікам, мастакомафарміцелем і г. д.

Адзін мой знаёмы таксама трапіў у падобнае становішча. Доўга не разважаючы, ён вырашыў: пайду працаваць. Але — проста сказаць. Ажыццявіць намер майму знаёмаму не давялося. У пазаведамаснай ахове яму адмовілі. Адмовілі і ў многіх іншых месцах, а ў трамвайным парку, дзе патрэбен быў мастак, сказалі вельмі проста: «Студэнт? Не, не патрэбен». І усюды прыкладна адзін адказ. У чым прычына?

Каб гэта высветліць, я вырашыў сам пабыць у ролі такога студэнта. Звярнуўся ў аддзел кадраў аднаго завода. Першае пытанне да мяне:

— Хто такі?
— Студэнт.
— Курс?
— Першы.
— Да пабачэння.
— Чаму?!
— Ды таму, што ў мяне і пяцікурснікі раз у тыдзень на работу з'яўляюцца, а ты — зялёны. Карацей, ідзі, хлопец...

Так. Выходзіць, вінаваты самі студэнты. Давайце паразважаем.

Напрыклад, удаецца ўладкавацца на работу, праўда, у большасці выпадкаў на начную. Пасля васьмі гадзін такой працы ўжо не да лекцый: хочацца спаць. У наступную ноч усё паўтараецца. І так увесь семестр. Потым сесія і, па-студэнцку кажучы, зноў «пралёт». І вучоба не ў радасць, і запомніцца толькі адно: пастаяннае жаданне выспацца і трывога за тое, як бы не страціць зручнае месца.

Гэта ўжо цэлая праблема. Дакладных лічбаў у мяне няма, але ведаю: многія «шчаслівчыкі» працуюць.

Так, працуюць. Нярэдка ў шкоду заняткам. Іх лаюць і даюць вымовы. А ўладкавацца на зручную работу ўсё цяжэй і цяжэй. І так дрэнна, і так не лепш. Галаваломка. Рэбус.

А што аб гэтым рэбусе думаюць прафсаюзная і камсамольская арганізацыі? На маё пытанне, ці можна стварыць і ў нас, як гэта зроблена ў ВНУ Ленінграда, студэнцкае бюро па працаўладкаванню ці нешта падобнае, начальнік штаба працоўных спраў камітэта камсамола А. Шыбут адказаў:

—Такога бюро ў нас няма. Быў выпадак: з некаторых паштовых аддзяленняў прыйшлі заявы на студэнтаў, якія жадаюць і могуць працаваць. Мы гэтыя заявы задаволілі, і на гэтым справа закончылася. Ды і самі студэнты не звяртаюцца да нас.

Не звяртаюцца таму, што не ведаюць, хто і як можа ім дапамагчы. І ідуць працаваць на свой страх і рызыку, уладкоўваюцца праз знаёмых, яшчэ як-небудзь... Здаецца, над гэтым варта падумаць. Гэта не дробязі, бо ў прамой залежнасці знаходзіцца акадэмічная паспяховасць многіх студэнтаў. Выйсце знайсці можна. Ці не ўтварыць сектар пры штабе працоўных спраў, які б займаўся непасрэдна гэтай праблемай? Можна наладзіць сувязь з прадпрыемствамі Мінска, сабраць спісы жадаючых працаваць па факультэтах...

Усё добра, але гэта толькі асабістыя думкі аўтара. Упэўнены, гэты артыкул не пакіне абыякавымі многіх студэнтаў, таму запрашаю ўсіх да размовы.

**С. ШАЎЦОЎ,**
**студэнт журфака.**

● МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ

# ДА СВЯТА СЯБРОЎ

У АЗНАМЕНАВАН Н Е 1300-годдзя ўтварэння Балгарскай дзяржавы рэктарат Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна сумесна з інстытутам гісторыі АН БССР і аддзяленнем Таварыства савецка-балгарскай дружбы правёў навуковую сесію. З уступным словам на адкрыцці выступіла дэкан гістарычнага факультэта прафесар І. В. Царук.

«Уклад балгарскага народа ў развіццё сусветнай культуры», «Інтэрнацыянальныя сувязі беларускага і балгарскага народаў», «Удзел Беларускай ССР у развіцці і ўмацаванні савецка-балгарскай дружбы», «Развіццё сяброўскіх сувязей паміж Ленінскім і Дзімітраўскім камсамолам», «Некаторыя пытанні ўдасканалення сацыялістычнай дэмакратыі НРБ у 70-я гады»—вось тэмы, якія абмяркоўваліся ў гістарыкаў. Дзве секцыі працавалі на філалагічным факультэце.

Юбілею брацкай краіны была прысвечана і савецка-балгарская студэнцкая навуковая канферэнцыя. Першакурсніца Дзіяна Славава і чацвертакурснік Мікалай Стаіменаў, студэнты з НРБ, расказалі аб савецка-балгарскіх адносінах, якія сталі прыкладам сацыялістычнага інтэрнацыяналізму ў дзеянні. Аб развіцці культурнага супрацоўніцтва паміж СССР і НРБ расказала студэнтка III курса Вольга Лосік. Канкрэтныя звесткі аб вытворчых сувязях паміж калектывамі Мінскага і Карлаўскага трактарных заводаў прадставіў студэнт-вячэрнік Віталь Спевак.

Аб мірным і стваральным жыцці балгарскіх сяброў расказалі выдатна аформленыя фотавыстаўкі, адна з якіх даслана нашаму універсітэту Усенародным камітэтам балгара-савецкай дружбы, другую—«Рашэнні XII з'езда БКП—у жыццё» падрыхтавалі студэнты III курса гістарычнага факультэта.

Удзельнікі навуковай канферэнцыі мелі магчымасць пазнаёміцца з кнігамі аб гісторыі і культуры краіны, аб руска-балгарскіх і савецка-балгарскіх зносінах, што экспанаваліся на кніжнай выстаўцы, якую падрыхтавалі супрацоўнікі універсітэцкай бібліятэкі.

**Д. БАРЫСАЎ.**

● СТУДЭНТ І НАВУКА

# ШЛЯХАМІ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

СТУДЭНЦКАЙ навукова-даследчай лабараторыяй на кафедры радыёфізікі і электронікі кіруе дацэнт В. І. Мікуловіч. Асноўны навуковы кірунак лабараторыі — вібраакустычная дыягностыка механічных сістэм. Работы СНДЛ маюць вялікае практычнае прымяненне ў народнай гаспадарцы і ўключаюць у сябе наступныя ўзаемазвязаныя напрамкі: тэарэтычныя даследаванні, накіраваныя на вывучэнне і распрацоўку найбольш эфектыўных метадаў аналізу сігналаў; апаратурную рэалізацыю прылад для вібраакустычнага кантролю; распрацоўку метадаў аналізу сігналаў з выкарыстаннем універсальных ЭВМ.

Актыўны ўдзел у рабоце СНДЛ прымаюць студэнты IV курса М. Бядулін і А. Крот, П. Каржукоў з V курса. Супрацоўнікамі студэнцкай лабараторыі штогод выконваюцца навукова-даследчыя работы на суму больш чым 50 тысяч рублёў. Вынікі многіх з іх неаднаразова адзначаліся на рэспубліканскіх і ўсесаюзных выстаўках (тры бронзавыя і адзін сярэбраны медалі), на ўсесаюзных і рэспубліканскіх аглядах-конкурсах (дыпломы УСНТТ, Мінвуза БССР, прэміі).

Вопыт СНДЛ кафедры радыёфізікі і электронікі нагляднa паказвае, што гэта форма студэнцкай навуковай работы дазваляе найбольш эфектыўна выкарыстаць навуковы патэнцыял прыродазнаўчых факультэтаў. З нашага пункту гледжання работа ў СНДЛ прывівае густ да вялікай навукі, садзейнічае фарміраванню высокаэрудзіраваных, тэхнічна адукаваных спецыялістаў.

**І. БІРУЛЯ,**
**член СНТ факультэта радыёфізікі і электронікі.**

**ПРАЦЯГВАЕЦЦА першынство універсітэта па летняму мнагабор'ю ГПА (бег на 100, 1000, 3000 метраў; скачкі ў даўжыню; кіданне гранаты; плаванне; стральба). Пасля двух дзён спаборніцтваў месцы сярод факультэтаў размеркаваліся наступным чынам (у дужках колькасць набраных балаў):**

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Мехмат | (180) |
| 2. | Гістфак | (150) |
| 3. | Радыёфізікі і электронікі | (120) |
| 4. | ФПМ | (90) |
| 5. | Юрфак | (80) |
| 6. | Геафак | (70) |
| 7. | Фізфак | (60) |
| 8. | Філфак | (50) |
| 9. | Біяфак | (40) |
| 10. | Хімфак | (30) |
| 11. | Журфак | (0) |





**НА ЗДЫМКАХ: старт кросу на 3000 метраў; пераможца ў гэтым спаборніцтве — студэнт 1-га курса хімфака, член зборнай каманды універсітэта Герман Маскаленка. Яго вынік— 9 мінут 21,8 секунды.**

Фота **В. Шачака.**


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

21 мая 1981 г.
Заказ 856. АТ 02274

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ